# Сцежкамі нашых продкаў





*ДУА «Сярэдняя школа №5 г. Вілейкі»*

# Сцежкамі нашых продкаў

***(міні – экскурс у Музей народнай культуры Вілейшчыны)***

***Вілейка***
***2021г.***

# *Спадчына*

*Трэба ведаць – сэрца просіць,*
*Як дзядам, бацькам жылося…*
*Як сахой даўней аралі,*
*Як смыком зямлю бярлялі,*
*Як з сявалкі збожжа-зерне*
*Рассявалі чорнай жменяй…*
*Трэба ведаць, што зазналі,*
*Як на пана працавалі…*
*Трэба ведаць і пра тое,*
*Апраналі што? Якое?..*
*Як у святы гасцявалі,*
*Як з фашыстам ваявалі,*
*На вячорках як спявалі…*
*Гэта спадчына святая,*
*Непрыдуманая, тая,*
*Што спакон вякоў вялася,*
*Што ў сэрцы засталася.*
*П. Броўка*



*Музей народнай культуры Вілейшчыны быў заснаваны ў 2013 годзе на базе ДУА «Сярэдняя школа №5 г. Вілейкі». Экспанаты, якія знаходзяцца ў музеі, збіраліся настаўнікамі і вучнямі не адзін год. Некаторым з іх больш за сто гадоў. Хочацца адзначыць, што адметнай асаблівасцю рэчаў, прадстаўленых на выставе, з'яўляецца тое, што ўсе яны выраблены ўручную і выпраменьваюць энергетыку таго часу.*

# *Ад першай калысці*

*Ад калыскі - люлькі ўтульнай*
*Дзень ноч - па гэты час -*
*Наша мілая матулька*
*Клапацілася пра нас.*
*Малаком усмак паіла,*
*Укладала песняй спаць,*
*Роднай моваю вучыла*
*Словы добрыя казаць.*
*Ніл Гілевіч*





*Жыцце кожнага чалавека пачынаецца з маленства, з матулінай песні, з першай калыскі.*

***Калыска (люлька, зыбка)*** *— месца, дзе знаходзіцца дзіця ў першы год пасля нараджэння. Калыска магла быць размешчана на падлозе ці, як у нашым музеі, быць прымацавана да столі.*

*Падчас вырабу калыскі прытрымліваліся* ***строгага правіла****: яе павінен быў зрабіць нехта з мужчын сям'і: бацька, дзед або родны дзядзька дзіцяці.*

*У традыцыях усходніх славян было прынята ўпрыгожваць калыску роспісам, інкрустацыяй, разьбой. У калыску клалі рэчы-абярэгі.*

# Побыт беларусаў

*Побач з люлькай размяшчаецца* ***печ*** *- сімвал цяпла і ўтульнасці. Печ займала ў сялянскай хаце важнае і пачэснае месца. Абагравала хату, у ёй варылі ежу, на ёй грэліся, адпачывалі, лячыліся, сушылі адзенне і абутак.*

*Да печы адносіліся як да жывой істоты. Забаранялася ўжываць “у яе прысутнасці” грубыя і непрыстойныя словы. Зразумела, печ ужо не мае той сакральнасці, як у даўніну, але яе роля як* ***сімвала дамашняга ачага*** *захоўваецца ў народным усведамленні і сёння.*

*Каля печы знаходзіўся качарэжнік. Тут стаяў пячны інвентар:* ***качарга, вілы, чапяла і абавязкова хлебная лапата.***

*Дзе печ, там і тое, што з печы, гарачая і смачная ежа. І ў першую чаргу –* ***хлеб****. Хлеб выпякалі жытні, вельмі духмяны. Пшанічны гатавалі радзей.*







# *Побыт беларусаў*

*Найбольш шаноўнае месца ў хаце – гэта* ***покуць****. Лічылася, што покуць – гэта частка храма ў хаце. На покуці развешвалі абразы, убраныя ўзорнымі ручнікамі, пучкі асвечаных у царкве жытнёвых каласоў і траў. Восенню тут ставіўся самы першы сноп. Лічылася, што покуць спрадвеку ачышчала і ўзвышала чалавека, рабіла яго лепшым.*

*На покуці мясціліся стол і лава. Стол выконваў ролю своеасаблівага хатняга алтара, таму ставіліся да яго з павагай. Дапусціць на стол ката лічылася вялікім грахом, бо тут заўсёды знаходзіліся хлеб ды соль. Калі прыходзіла свята, на покуці першы садзіўся гаспадар, а злева ад яго астатнія - сямейнікі. Маліліся, успаміналі добрым словам дзядоў-прадзедаў, частаваліся.*

*Звярніце, калі ласка, увагу на гліняны посуд. Ён і сёння карыстаецца попытам. Прыгожа глядзіцца ён і на кухоннай паліцы, і на абедзенным стале.*

*А ў нашых прашчураў гліняныя вырабы былі на любы густ і для розных патрэб.* ***Гарлачыкі, збаны, глякі, гаршкі-спарышы.***







# *Заняткі, гаспадарчыя рэчы*

*Чым жа любілі займацца нашы продкі?*

*Вечарамі, асабліва ў зімовы час, сялянская хата ператваралася ў майстэрню. У доўгія вечары пры святле лучыны тут рабілі лыжкі і посуд, плялі лапці і пралі, ткалі, шылі адзенне і вышывалі.*

*У кожнай сялянскай хаце можна было ўбачыць* ***зручны абутак****, плецены з лыка, лазовай кары, бяросты. Плялі лапці звычайна мужчыны.*





*Адным з самых старажытных промыслаў беларусаў было* ***ткацтва****. На працягу стагоддзяў яно перадавалася з пакалення ў пакаленне. Сыравінай для ткацтва быў* ***лён*** *або* ***авечая воўна****.*

*У нашай музейнай хаце знаходзяцца некаторыя прылады ткацтва:* ***калаўрот, прасніца, шчотка, верацяно****. І канешне, гонар нашага музея -* ***кросны****.*



# *Заняткі, гаспадарчыя рэчы*

*Частка экспазіцыі прысвечана* ***гаспадарчым рэчам****. Есць прыстасаванні для разгладжвання вырабаў з тканіны:* ***качалка****,* ***валік****, калекцыя жалезных* ***прасаў****.*

*Тут можна ўбачыць* ***лыжкі****,* ***маслабойкі****,* ***начоўкі****, у якіх мылі бялізну і купалі дзяцей, гліняны посуд.*

*Ёсць і* ***кош****, незвычайны, з накрыўкай. Ён выкарыстоўваўся для захоўвання каўбас, кумпякоў, для сушкі тварожных сыроў, як ёмістасць пад збожжа, для пераносу груза на плячах і іншых мэтаў.*









# З бабулінага куфра

*Хоць і цяжка жылося нашым продкам, але не страцілі яны пачуцця прыгожага. Усё рабілі сваімі рукамі, пачынаючы ад тканіны да ўзораў вышыўкі на ручніках і посцілках. Вочы разбягаюцца ад прыгажосці фартушкоў , абрусаў і ручнікоў. Не, такіх абноў у краме не купіш: у іх жыццё, натхненне, душа таленавітых народных творцаў!*



*У экспазіцыі нашага музея прадстаўлена* ***рэканструкцыя вілейскага жаночага строю*** *2-ой паловы XIX – 1-ай паловы XX стагоддзя. У жаночы гарнітур уваходзяць* ***блузка, спадніца, фартух, гарсэт****.*

*Вышывала маці... У руках,*
*Як вясёлкі, ніткі мільгацелі.*
*Клаліся на белых ручніках*
*Роднай нівы фарбы і адценні.*
*Расцвіталі ружы і ляны*
*Ў непаўторных веснавых узорах.*
*Упляталіся напевы, сны,*
*Промні сонца і далёкіх зорак.*
*А. Пысін*



# *З бабулінага куфра*

***Ручнік*** *– гэта сімвал чысціні, цяпла беларускай зямлі і роднай хаты.*

*З асаблівай панаўтой праявілася майстэрства і мастацкі густ ткачых і вышывальшчыц пры аздабленні ручнікоў. Іх упрыгожвалі карункамі. Уражвае тое, што ўсе карункі, якія ёсць у музеі, непаўторныя па сваім арнаменце. Колькі ж трэба было мець фантазіі і выдумкі, каб стварыць такую прыгажосць!*



***Ручнікі*** *не толькі ўпрыгожвалі інтэр'ер, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах і святах, асабліва сямейна-родавай накіраванасці: пры нараджэнні дзіцяці, на вяселлі і ў час пахавання.*

*А яшчэ ў беларускім сялянскім інтэр'еры быў* ***куфар****. У ім захоўвалі тканіну, адзенне, бялізну, каштоўнасці. Некаторыя куфры захаваліся і да нашага часу, прыкладам таму наш музейны.*

# *Сялянская сядзіба, будаўніцтва*

*У нашай экспазцыі* ***прадстаўлена схема сялянскай сядзібы*** *канца XIX-га – першай паловы XX-га ст, паводле малюнкаў архітэктара, мастака  і краязнаўцы з Вілейкі Анатоля Капцюга. За ўзор ён узяў сядзібу свайго дзеда Грышкі, што меў свой хутар паміж Бараўцамі і Урэччам. На малюнку ёсць усе асноўныя пабудовы****: хата, камора, клець, паветка, пуня, хлявы для буйной і дробнай жывелы****.*



*Сядзіба будавалася талакой – дапамагала ўся радня і ўся вёска. Асноўным будаўнічым матэрыялам было* ***дрэва****. На выставе вы можаце ўбачыць прылады для яго апрацоўкі:* ***пілу, сякеру, цясло, скоблю, драку*** *і іншыя інструменты. Страха накрывалася* ***саломай****.*






# *Земляробства, гаспадарка*

*Амаль кожны сялянскі двор на працягу стагоддзяў уяўляў сабой* ***універсальную гаспадарку****, якая цалкам забяспечвала свае патрэбы: вырошчвала збожжа, выпякала хлеб, гатавала розныя прадукты, апрацоўвала лён, футра, скуры. Вельмі цяжкай працай было земляробства. Здабываючы хлеб, селянін разлічваў толькі на свае сілы і дапамогу хатняй жывелы. У нашай экспазіцыі прадстаўлены прылады працы земляроба****: саха, драўляная барана, серп, цэп, вілы, каса*** *і іншыя.*

*Можна ўбачыць збрую для каня:* ***хамут, падсядзёлак, дугу, падкову****. Гэтыя прылады працы даюць магчымасць прасачыць цяжкі шлях атрымання хлеба – ад ворыва да бохана хлеба на стале.*







# *Сям'я, род*

*Гістарычная памяць, без якой не можа быць паўнавартаснага народа, пачынаецца з натуральнага імкнення чалавека пазнаць самога сябе, з жадання даведацца, хто і адкуль ён. Існуе паданне, што ў нашых продкаў крывічоў быў такі звычай. Калі юнак дасягаў паўналецця, каб звацца мужчынам, ён мусіў выканаць чатыры выпрабаванні – пераплысці паўнаводную раку, упаляваць зубра ці мядзведзя, раскласці ў дождж вогнішча і назваць сваіх продкаў да пятага калена. Чалавеку, які не ведаў сваіх продкаў, не давяралі, лічылі здольным да здрады, маглі нават прагнаць з абшчыны.*

*Магнаты і заможная шляхта складалі радаводы па мужчынскай лініі, каб паказаць ці даказаць старажытнасць свойго роду і пахваліцца перад суседзямі высокімі пасадамі продкаў.*




*Прыклад з радаводу Ходзькаў*

# *Святы і абрады беларусаў*

*Абрады і святы, якія выдатна захаваліся на беларускай зямлі, характарызуюць народ, які тут жыве.*

*Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў з'яўлялася неад'емнай часткай народнага побыту, сямейнага ўкладу, духоўнай культуры народа.*

*Сямейныя звычаі і абрады аб'ядноўвалі сям'ю, служылі своеасаблівым механізмам для перадачы этнічных традыцый, маральна-этычных нормаў і прынцыпаў ад старэйшых да малодшых.*

*Старажытныя абрады можна назіраць і сёння. Многія з іх перайначыліся, значэнне іншых насельніцтва сучаснай Беларусі ўжо забылася, але тым не менш працягвае іх выконваць.*

*Масленіца, Купалле, Каляды, Дажынкі – у кожным з гэтых святаў, як і ў тысячы іншых, прасочваюцца элементы старажытных язычніцкіх вераванняў. Гэтыя вераванні вельмі арганічна ўпляліся ў хрысціянскую веру, і ў выніку атрымалася непаўторная і каларытная беларуская культура.*





# Ганарымся мінулым, цэнім сучаснае

*Існуе такая легенда. Чалавеку сказалі, каб ён, адыходзячы ад хаты, не азіраўся назад, іначай ператворыцца ў слуп солі. Чалавек не стрымаў слова і азірнуўся... Ды як жа не азірнешся, калі родная сядзіба – гэта цэлы свет!*



*Часцей азірайцеся, сябры, назад, у мінулае, каб не пагасла свечка на покуці ў бацькоўскай хаце, каб лягчэй было ісці наперад, у будучыню.*

*Кожны куточак на Беларусі захаваў свае адметныя асаблівасці, сваю самабытнасць. Застаецца толькі знайсці і зберагчы гэтыя дары. Гэта мы і спрабуем зрабіць у школьным Музеі народнай культуры Вілейшчыны. Тут можна зазірнуць у мінулае. Адчуць спадчыну свайго народа.*

# *Экскурсіі*

*Любоў да Радзімы, імкненне самааддана служыць свайму народу, захоўваць яго мову, культурную і гістарычную спадчыну, звычаі і традыцыі немагчымы без дасканалага вывучэння роднага краю.*

*Мерапрыемствы і экскурсіі, якія праводзяцца ў нашым музеі, накіраваны на засваенне навучэнцамі агульначалавечых каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый беларускага народа.*

*Менавіта ў школьным музеі дзеці ўпершыню пачынаюць асэнсоўваць сваё дачыненне да ўсяго, што адбываецца навокал, а словы Радзіма, родны кут і патрыятызм напаўняюцца новым сэнсам.*

*Кіраўнік нашага музея вядзе актыўную работу па падрыхтоўцы творчай групы экскурсаводаў, якія заўсёды рады новым наведвальнікам і гасцям.*





## *Экскурсіі*







***Сардэчна запрашаем***
***у наш Музей народнай культуры Вілейшчыны!***



**Адрас:**
**222410, Мінская вобл.,**
**г. Вілейка, вул. Касманаўтаў, 26,**
**тэл. (801771) 31409,**
**факс (801771) 31412,**
**e-mail: sch5@vileyka-edu.gov.by**

**Кіраўнік музея:**
**Данілава Таццяна Станіславаўна,**
**тэл. (8029) 6552977**